УДК 94(476)

***Пілецкі Віктар***
*Мінскі інавацыйны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

# СПЕЦЫФІКА ЭВАЛЮЦЫІ АДУКАЦЫЙНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XIX СТ.)

Сканцэнтравана ўвага на выключна складаным перыядзе эвалюцыі адукацыйна-выхаваўчага працэсу беларускіх зямель, абумоўленым магутнымі палітычнымі працэсамі, што адбываліся ў той час ў гісторыі Беларусі.

***Ключавыя словы: адукацыйна-выхаваўчы працэс; Адукацыйная Камісія; Віленская навучальная акруга; Полацкая езуіцкая акадэмія; русіфікацыя школьнай справы на тэрыторыі Беларусі; “тайныя таварыствы”***

Спецыфіка эвалюцыі адукацыйна-выхаваўчага працэсу ў Беларусі канца XVIII – пачатку XIX ст. найперш была абумоўлена форс-мажорнымі агульнапалітычнымі абставінамі. Беларускія землі ў той час былі часткай Рэчы Паспалітай, якая аказалася падзеленай паміж моцнымі суседнімі дзяржавамі Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй падчас вядомых трох падзелаў 1772, 1793, 1795 гг.

На працягу больш чым двадцаці гадоў, пакуль адбываўся працэс далучэння беларускіх зямель да суседняй дзяржавы, адукацыя і выхаванне падрастаючых пакаленняў адбывалася ў цэлым шэрагу розна-

планавых навучальных устаноў, з рознай ведамаснай падпарадкаванасцю, па розных навучальных праграмах, а таксама методыках навучання і выхавання.

На тэрыторыі Заходняй і Цэнтральнай Беларусі, развіццё школьнай справы адбывалася на прынцыпах, закладзеных у структуру і характар выхаваўча-адукацыйнага працэсу падчас дзейнасці Адукацыйнай Камісіі (1773–1792) [1, с.208–210]. Гэты орган быў створаны для кіравання сферай адукацыі, пасля выдання ў 1773 г. папам Кліментам XIV вядомага брэве “*Dominus ac Redemptor*”, што палажыла пачатак ліквідацыі езуіцкага ордэна ў Еўропе, Рэчы Паспалітай і ВКЛ [2; 3]. У адпаведнасці са “Статутам...” Адукацыйнай Камісіі, дзейнічала трохступенная сістэма адукацыі: “Галоўная школа ВКЛ” (створана ў 1773 г. на базе Віленскай езуіцкай акадэміі), якая была навуковай і адміністрацыйнай структурай адначасова і давала вышэйшую (універсітэцкую) адукацыю. Былі “акруговыя” і “падакруговыя” школы сярэдняй ступені адукацыі, а таксама, часткова, пачатковая адукацыя ў форме “парафіяльных” школ.

Усходнебеларускія землі, якія ўвайшлі ў склад Расіі падчас першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.), мелі сваю спецыфіку ў адукацыйнай сферы. Тым больш, што рускі царызм, у палітычных мэтах, захаваў на гэтай тэрыторыі езуіцкі ордэн [4, с. 20–26]. Тут дзейнічалі два тыпы школ: рускія (свецкія) школы і вучылішчы манаскіх ордэнаў (езуіцкія, дамініканскія, піярскія, базыліянскія). Большасць дзяцей навучальнага ўзросту наведвалі ордэнскія школы, якія на той час былі больш распаўсюджанымі, мелі лепшую аснашчанасць настаўніцкімі кадрамі і вучэбнымі матэрыяламі. Адзінага кіруючага органа, альбо абавязковых вучэбных праграм не існавала. Інакш кажучы “сістэмы адукацыі”, як адзінага механізма, тут не было.

Нават пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, на тэрыторыі Цэнтральнай і Заходняй Беларусі, як і раней дамінавалі свецкія акруговыя і падакруговыя школы, створаныя Адукацыйнай камісіяй. Езуіцкіх навучальных устаноў тут не існавала зусім (дзейнасць Ордэна была пад забаронай), а манаскія школы іншых ордэнаў былі. Але іх распаўсюджанасць была значна абмежавана.

Рускі царызм толькі пасля прыходу да ўлады Аляксандра I, у 1802 годзе, пачаў праводзіць школьную рэформу што пэўным чынам змяніла школьна-палітычныя прыярытэты [5]. З 1803 года Галоўная школа ВКЛ была пераіменавана ў “Віленскі універсітэт”. Ён меў не толькі статус ВНУ (быў вышэйшай навучальнай і навуковай установай), але і выконваў функцыі адміністрацыйнага цэнтра “Віленскай навучальнай акругі”, якая ўключала ў сябе тэрыторыю васьмі губер-

няў Расійскай імперыі (Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілеўскай, Віцебскай, Валынскай, Падольскай і Кіеўскай).

Віленскую навучальную акругу ўзначаліў князь Адам Чартарыйскі (гг.ж.: 1770–1861), які значна паспрыяў росквіту ўніверсітэта. А. Чартарыйскі займаў пасаду апекуна на працягу дваццаці гадоў (да 1823 года), сумяшчаючы яе з выкананнем функцый "таварыша міністра замежных спраў" (1802–1804) і "міністра замежных спраў" (1802–1807).

Рэфарматары стварылі некалькі тыпаў навучальных устаноў [6]. Пачатковая адукацыя для падатковых саслоўяў давалася ў аднакласных прыходскіх вучылішчах. Сярэднюю адукацыю можна было атрымаць у "павятовых вучылішчах" і "гімназіях". Вышэйшую адукацыю даваў "Віленскі ўніверсітэт". Школа мела саслоўны характар.

З гэтага часу ўвесь працэс адукацыі і выхавання пачаў ажыццяўляцца на рускай мове. Да 30-х гг. XIX ст., як вядома, значнае месца ў навучальным працэсе мела польская мова. Для дзяцей падатковых саслоўяў доступ у гімназіі быў абмежаваны, а ва ўніверсітэт іх паступленне было ўвогуле немагчымым.

У той жа час, як і раней, акрамя свецкіх школ на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі навучальныя ўстановы пры каталіцкіх кляштарах і базыльянскіх манастырах, якія вялі выкладанне на польскай мове. Іх колькасць паступова скарачалася па прыказу кіраўніцтва краіны, а ў 1832 г. яны ўвогуле былі пераўтвораны ў свецкія школы. Школы манаскіх ордэнаў давалі сярэднюю адукацыю і прыраўноўваліся да павятовых вучылішчаў ці гімназій. Адной з іх, што атрымала найбольшую вядомасць, была "Полацкая езуіцкая акадэмія".

Узровень адукацыі, які там даваўся, быў падобны да вышэйшай навучальнай установы. Пасля выгнання (у 1820 г.) з тэрыторыі Расійскай імперыі езуітаў, на базе гэтай навучальнай установы быў утвораны "Полацкі кадэцкі корпус".

Акрамя вышэй адзначаных навучальных устаноў, на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі прыватныя вучылішчы і пансіянаты. Жаночая адукацыя адбывалася менавіта праз гэтыя навучальныя ўстановы і хатніх настаўнікаў. Існавалі таксама ўстановы для яўрэяў, якія складалі тады значную частку гарадскога насельніцтва Беларусі. Іх адукацыя мела пераважна рэлігійны характар і ажыццяўлялася на яўрэйскай мове. У 1844 годзе у праграмы яўрэйскіх школ была ўведзена руская мова. Школы называліся "талмуд-торы", "хадарымы" і інш. Яны фінансаваліся за кошт яўрэйскіх абшчын і займаліся вывучэннем свяшчэнных кніг іўдаізму пад кіраўніцтвам меламедаў і равінаў.

Тэрыторыю Беларусі закранула і надзвычай распаўсюджаная ў

Еўропе ў 20-х гадах XIX ст. “ланкастарская” адукацыя. На тэрыторыі Беларусі гэты від школ з’явіўся ў 1821 годзе. Адрозненне такіх адукацыйных установ, што зарадзіліся ў Англіі XIX ст., заключалася ва ўзаемным навучанні. Старэйшыя вучні, пад кіраўніцтвам настаўніка, навучалі малодшых [7, с. 332]. Адной з першых у межах ВКЛ, была школа для сялян, адкрытая ў Шчорсах удзельнікам паўстання пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі 1794 г., візітатарам школ Віленскай акругі, мецэнатам – Адамам Храптовічам (1768–1844) [8].

Гэта была буйная навучальная установа (у 1822 г., там навучалася каля 350 чалавек – выхадцаў з прыгонных сялян), дзе дзеці, разам з элементарнай адукацыяй, набывалі разнастайныя жыццёва-практычныя і рамесніцкія веды і навыкі. Існавала ў Шчорсах і фамільная бібліятэка Храптовічаў. Яна была адной з самых буйных бібліятэк у Беларусі, дзе захоўвалася каля 20 тыс тамоў кніг (творы антычных аўтараў, французская і італьянская класічная літаратура, працы па гісторыі Польшчы, Беларусі, Літвы, рукапісы). Спецыяльна, каб папрацаваць у гэтай бібліятэцы, у Шчорсы прыязджалі вядомыя ў ВКЛ і Беларусі навукоўцы і літаратары: І.Лялевель, Я. і А.Снядэцкія, У.Сыракомля, Ф.Малеўскі і інш. Лічаць што менавіта там ствараў сваю знакамітую паэму "Гражына" класік беларускай і польскай літаратур Адам Міцкевіч.

Бібліятэка Храптовічаў, як і многія іншыя каштоўнасці са спадчыны беларускага народа, была страчана ў перыпетыях складанай беларускай гісторыі. У 1913 г., яе са Шчорсаў перадалі на “часовае” захоўванне Кіеўскаму ўніверсітэту. Асноўная частка бібліятэкі так і засталася ў Кіеве і цяпер знаходзіцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Украіны, адкуль вярнуць яе ў Беларусь на сённяшні дзень не прадстаўляецца магчымым.

Цалкам, у першай чвэрці XIX ст., асвета на тэрыторыі Беларусі, асабліва ў заходняй яе частцы, была моцна спаланізавана. Асноўнай мовай выкладання прадметаў у навучальных установах была польская мова. Сярод прадметаў, якія вывучаліся навучэнцамі, важнае месца займалі гісторыя Польшчы і польская літаратура. Царызм ва ўмовах руска-французскай вайны 1812 г. і пасля яе яшчэ баяўся праводзіць русіфікацыю насельніцтва і шукаў падтрымкі польскай шляхты ў мэтах заспакаення грамадска-палітычнай сітуацыі, абвостранай пасля Падзелаў Рэчы Паспалітай. У гэтых умовах прыхільнікі аднаўлення Рэчы Паспалітай пад пакравіцельствам папячыцеля Віленскай навучальнай акругі і куратара ўніверсітэта А. Чартарыйскага змаглі зрабіць асвету сродкам распаўсюджвання ідэалаў польскага нацыянальнага руху.

Канкрэтныя крокі па русіфікацыі школьнай справы на тэрыторыі Беларусі царскі ўрад пачаў рабіць пасля раскрыцця дзейнасці студэнцка-вучнёўскіх “тайных таварystваў” у 1820-х гг. Рускую мову зрабілі абавязковым прадметам і мовай выкладання дысцыплін [9]. Замест польскай гісторыі і літаратуры пачалі вывучаць гісторыю Расіі і рускую літаратуру. У гэты час былі разгромлены студэнцка-вучнёўскія тайныя таварыствы (“філаматы” і “філарэты”). Іх у навуковай літаратуры часта называюць “ліцвінскімі патрыётамі”. Яны вывучалі гісторыю і культуру Беларусі, лічылі сябе “літвінамі”, любілі Беларусь (як гістарычную “Літву”), марылі пра збаўленне ад панавання рускага царызму на беларускіх землях і аднаўленне ВКЛ і РП.

Падводзячы вынік сказанаму можна адзначыць, што асаблівасці арганізацыі адукацыйна-выхаваўчага працэсу на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. былі цесна звязаны з палітычнымі працэсамі, якія мелі месца ў гэты перыяд. Адукацыйна-выхаваўчая сфера, як заўсёды ў гісторыі, была найбольш мабільнай і адчувальнай да перамен. Змяняліся палітычныя ўмовы: падзелы Рэчы Паспалітай; закрыццё Ордэна езуітаў; падыходы ўладных органаў да праблем “паланізацыі” ці “русіфікацыі” беларускіх зямель; і інш. – змянялася і адукацыйна-выхаваўчая сфера. З’яўляліся (ці знікалі) розныя віды школ, з рознымі праграмамі навучання, прыярытэтамі ў выхаванні і адукацыі, з рознай методыкай і задачамі па падрыхтоўцы падрастаючых пакаленняў.

1. Адукацыйная камісія // Вялікае княства літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя, У 2 т.; рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]; Т.1. (Абаленскі – Кадэнцыя). – Мінск: “Беларуская энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі”, 2007 – 684 с.

2. Бреве // Католическая энциклопедия / Словари и энциклопедии на Академике // [Электронный ресурс]. – 2020. – Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/catholic/342. – Дата доступа: 06.10.2020.

3. Dominus ac Redemptor // [Электронный ресурс]. – 2020. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Dominus_ac_Redemptor. – Дата доступа: 09.10.2020.

4. Нижинская, М.М. Сохранение ордена иезуитов в Российской империи как отражение государственно-религиозной политики на присоединенных западных территориях во второй половине XVIII века / М.М. Нижинская // Вестник Московского гос. пед. ун-та. Сер. «Исторические науки», №4 (32). – М. «МГПУ». 2018. // [Электронный ресурс]. – 2020. – Режим доступа: https://vestnik.mgpu.ru/pdf/1604.pdf. – Дата доступа: 03.10.2020.

5. Гришин, А.В. Политика в области народного просвещения Российской империи первой четверти XIX века / А.В.Гришин, В.А.Гришин // Вестник Брянского государственного университета. 2014, №1 // [Электронный ресурс]. – 2020. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/politika-v-oblasti-narodnogo-prosvescheniya-rossiyskoy-imperii-pervoy-chetverti-xix-veka/viewer. –Дата доступа: 07.09.2020.

6. Калинина, Е.А. Школьная реформа Александра I и “Положение об училищах” 1804 года / Е.А.Калинина // Власть, общество, армия. М. 2013 // [Электронный ресурс]. – 2020. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/shkolnaya-reforma-aleksandra-i-i-polozhenie-ob-uchilischah-1804-goda/viewer. – Дата доступа: 12.09.2020.
7. Марчанка, М. Ланкастэрскія школы / М. Марчанка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.4 (Кадэты – Ляшчэня) / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г.П.Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск, БелЭн. 1997. – 432 с.
8. Канцлер Хрептович возвращается в Щорсы (кто был по этническому происхождению канцлер ВКЛ Хрептович?) // СБ: Беларусь сегодня №18 (24648). Пятница, 30 января 2015 г. // [Электронный ресурс]. – 2020. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/kantsler-khreptovich-vozvrashchaetsya-v-shchorsy.html. – Дата доступа: 28.09.2020.
9. Куль-Сяльверстава, С.Я. Культура Беларусі ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст. / С.Я. Куль-Сяльверстава // [Электронный ресурс]. – 2020. – Рэжым доступу: http://jivebelarus.net/culture/culture-belarus-at-18-19-century.html. – Дата доступу: 09.09.2020.

## SPECIFICS OF THE EVOLUTION OF THE EDUCATIONAL PROCESS IN BELARUS (LATE XVIII-EARLY XIX CENTURIES)

***Viktor Piletsky***
*Minsk Innovation University, Minsk, Belarus, ekonhistbel@mail.ru*

The article focuses on an extremely complex period of the evolution of the educational process in the Belarusian lands, due to the powerful political processes that took place at that time in the history of Belarus.

***Keywords: educational process; educational Commission; Vilna school district; Polotsk Jesuit Academy; Russification of school Affairs on the territory of Belarus; “secret societies”.***